FIAT VOLUNTAS TUA

# Episcopus Dioecesis Vitebscensis

Romana Catholica Ecclesia in Ruthenia Alba

Vul. Voinau Internacyjanalistau 28/2, 210032 Vitebsk, Belarus,
(+375 212) 61 68 69 , e-mail: dieceziavitebsk@gmail.com

БІСКУП ВІЦЕБСКІ

Віцебск, 04 снежня 2015 г.

№ 25/11/......./2015/Бп

## ДЭКРЭТ

### устанаўліваючы ў Віцебскай Дыяцэзіі касцёлы, у якіх будуць адкрыты ў Юбілейным Годзе Брамы Міласэрнасці

*Бог міласэрны і літасцівы, доўгацярплівы і шматміласцівы (Зых 34, 6), пажадаў, каб чалавек мог няспынна пазнаваць Яго боскую сутнасць розным чынам і ў розныя моманты гісторыі. (...) Міласэрнасць – гэта найвышэйшы і канчатковы чын, праз які Бог выходзіць нам насустрач. (...) Міласэрнасць – гэта шлях, які лучыць Бога з чалавекам, бо адкрывае сэрца на надзею, што мы будзем умілаваныя назаўсёды, нягледзячы на недасканаласць, якой ёсць грэх* (*Misericordie Vultus* 1-2).

Буллай *Misericordie Vultus* з 11 красавіка 2015 г. Святы Айцец Францішак абвясціў Надзвычайны Юбілей Міласэрнасці, які распачнецца 8 снежня 2015 г., ва ўрачыстасць Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Дзевы Марыі, а скончыцца 20 лістапада 2016 г., ва ўрачыстасць Езуса Хрыста Валадара Сусвету. У дзень інаўгурацыі Святога Года Папа Францішак адчыніць у базыліцы св. Пятра ў Ватыкане *Святыя Дзверы, якія станyцца Брамай Міласэрнасці, дзе кожны, хто будзе ўваходзіць праз яе, зможа спазнаць любоў Бога, які суцяшае, прабачае і дае надзею* (*Misericordie Vultus* 3). Затым 13 снежня 2015 г. у III Нядзелю Адвэнту будуць адчынены Святыя Дзверы ў наступных папскіх базыліках, і ва ўсіх мясцовых Касцёлах.

Вернікі змогуць у гэтым Святым Годзе перажыць і атрымаць адпуст, адбываючы пілігрымку да Святых Дзвярэй, адчыненых у кожнай Катэдры і ў вызначаных дыяцэзіяльным біскупам касцёлах, а таксама ў чатырох Папскіх Базіліках у Рыме. Гэты момант мае быць злучаны з Сакрамантам Паяднання і поўным удзелам у св. Імшы, а таксама з задумай над міласэрнасцю. Пасля праходу праз Святыя Дзверы, акрамя звычайных умоваў вернікі будуць павінны

затрымацца на малітве, каб споўніць апошнія акты якія патрабуюцца: вызнанне веры і малітва за папу, а таксама малітва ў папскіх інтэнцыях. Папа Францішак прызнаў таксама магчымасць атрымаць адпуст паводле стану сэрца асобам хворым, у вязніцах і кожнаму, хто асабіста спаўняе справу міласэрнасці. Юбілейны адпуст можна будзе атрымаць таксама для памерлых (пар. *Misericordie Vultus*).

У адказ на папскую Буллу, у клопаце аб духоўным дабры ўсіх вернікаў нашай Дыяцэзіі, вызначаю акрамя нашага ***катэдральнага касцёла парафіі Езуса Міласэрнага ў Віцебску таксама касцёл парафіі Нараджэння Маці Божай у Браславе (дыяцэзіяльны Санктуарый Валадаркі азёраў)***, у якіх будуць адчынены Брамы Міласэрнасці.

Звяртаюся да душпастыраў якія служаць у гэтых касцёлах, каб з дапамогай святароў з суседніх парафій і дэканатаў забяспечылі па меры магчымасці сталы доступ да сакрамента пакуты і паяднання, каб як найбольшая лічба вернікаў магла атрымаць ласку міласэрнасці і індульгенцыю (адпуст). На час трывання Юбілея Міласэрнасці ўсе святары маюць права даваць адпушчэнне з грэху аборта, звальняючы праз ужыванне адпаведнай формулы, з кары экскамунікі.

На глыбокае духоўнае перажыванне Святога Года Міласэрнасці ўдзяляю ўсім пастырскае благаслаўленне, выпрашаючы шчодрыя Божыя дары.

† Алег Буткевіч
Біскуп Віцебскі

КАНЦЛЕР КУРЫІ